# ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСАЎ



ДУХОЎНАЯ
СПАДЧЫНА
БЕЛАРУСАЎ

Т.Б. ВАРФАЛАМЕЕВА



# Сямейныя абрады і звычаі



Мінск
«Вышэйшая школа»
2017

УДК 392.3(=161.3)
ББК 63.5(4Беи)
В18

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук *Т.В. Валодзіна*;
доктар мастацтвазнаўства *Н.А. Юўчанка*

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

*Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва.*

**Варфаламеева, Т. Б.**
В18 Сямейныя абрады і звычаі / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Вышэйшая школа, 2017. – 719 с. : каляр. іл. + 1 электрон. апт. дыск (CD).
ISBN 978-985-06-2629-5.

Прапануемае навукова-папулярнае выданне прысвечана сучаснаму стану трыяды абрадаў жыццёвага цыкла – радзінам, вяселлю, пахаванню. Найважнейшыя пераломныя моманты ў жыцці чалавека раскрываюцца як сукупнасць вузкалакальных традыцый, што, з аднаго боку, дае дэталёвае ўяўленне аб разнастайнасці кожнага абраду ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, з другога – сведчыць пра генетычную еднасць сямейна-абрадавых традыцый беларусаў.

Выданне ілюстравана фатаграфічнымі і нотнымі матэрыяламі. Электронны дадатак змяшчае вясельныя песні, запісаныя ад лепшых аўтэнтычных знаўцаў песенных традыцый.

Для шырокага кола чытачоў, зацікаўленых беларускім традыцыйным мастацтвам.

**УДК 392.3(=161.3)**
**ББК 63.5(4Беи)**

**ISBN 978-985-06-2629-5 (асоб. кн.)**
**ISBN 978-985-06-2628-8**

© Варфаламеева Т.Б., 2017
© Афармленне. УП «Выдавецтва “Вышэйшая школа”», 2017

# ЗМЕСТ


Абрады і звычаі жыццёвага цыкла ....... 6

**РАДЗІНЫ** ....... 23

Абрады і звычаі дародавага перыяду ....... 24
Роды ....... 33
Абрады і звычаі пасляродавага перыяду ....... 40
- Першае купанне ....... 40
- Выкормліванне дзіцяці ....... 44
- Абярэгі ад сурокаў ....... 46
- Адведкі ....... 48
- Кумы ....... 52
- Хрышчэнне, імянарачэнне ....... 55
- Хрэсьбіны ....... 59

Абрады і звычаі першага году жыцця дзіцяці ....... 72
Песні ў абрадзе радзін ....... 77

**ВЯСЕЛЛЕ** ....... 155

Выбар пары ....... 156
Перадвясельны перыяд ....... 160
- Сватанне, заручыны ....... 160
- Запаведзь (аглашэнне) ....... 202
- Маладая-сірата на магіле бацькоў ....... 205
- Вечарына напярэдадні вяселля ....... 212
- Каравай ....... 247
- Ёлка ....... 278

Перыяд вяселля ....... 285
- Першы дзень ....... 285
  - *Малады збіраецца ехаць да маладой* ....... 286
  - *Апрананне маладой* ....... 317
  - *Пасад* ....... 328
  - *Надзяленне і благаславенне маладой на Паазер'і* ....... 334
  - *У хаце маладой перад прыездам маладога* ....... 345
  - *Прыезд маладога* ....... 352
  - *Зборы і выезд да вянца* ....... 403
  - *Вянчанне* ....... 419
  - *Сустрэча маладых пасля вянца. Застолле ў маладой* ....... 437
  - *Абдорванне маладых. Падзел каравая* ....... 480
  - *Ад'езд маладой да маладога* ....... 504
  - *Прыезд маладой пары да маладога* ....... 548
- Другі дзень ....... 560
  - *Пасцельны абрад* ....... 560
  - *Застолле ў маладога* ....... 569
  - *Заканчэнне вяселля* ....... 604

Паслявясельны перыяд ....... 606

**ПАХАВАННЕ** ....... 611

Падрыхтоўка да смерці ....... 612
- Знакі набліжэння смерці ....... 614

Перадсмяротны стан ....... 618
- Смерць лёгкая, цяжкая, «наглая» ....... 618
- Душа ....... 622

Нябожчык у хаце ....... 625
- Першыя гадзіны пасля смерці ....... 625
- Абмыванне і апрананне нябожчыка ....... 628
- Труна ....... 633

Апошні шлях ....... 641
- Вынас труны ....... 641
- Шэсце на могілкі ....... 643
- На могілках ....... 646
- Пахаванне самагубцаў ....... 650

Памінальная трапеза ....... 652
Памінальныя дні ....... 655
«Той свет», рай, пекла ....... 657
Галашэнні і песні ў абрадзе пахавання ....... 661

# АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ ЖЫЦЦЁВАГА ЦЫКЛА

У традыцыйнай культуры беларусаў абрады сямейнага цыкла займаюць такое ж фундаментальнае месца, як і абрады цыкла каляндарнага. Абодва яны яскрава характарызуюць беларускі этнас, паколькі выражаюць калектыўныя ўяўленні аб сацыяльных формах узаемадзеянняў і стасунках людзей паміж сабой, культурных архетыпах, універсаліях, узорах ці стэрэатыпах паводзін, формах і спосабах выхавання і навучання, ведах пра чалавека і прыроду, вераваннях. Будучы шчыльна знітаванымі, гэтыя цыклы выконваюць, аднак, розныя сацыяльныя функцыі: каляндарныя забяспечваюць рытм жыцця калектыву, абрады сямейнага цыкла – рытм індывідуальнага жыцця чалавека.

Сямейныя звычаі і абрады аб'яднаны вакол найважнейшых пераломных момантаў жыцця чалавека: нараджэння, шлюбу і смерці. Значнасць гэтых вех жыццёвага цыкла ў далёкай старажытнасці спрыяла іх дэталёваму абрадаваму афармленню, і яны ў выніку працяглага гістарычнага развіцця замацаваліся ў выглядзе трох самастойных складаных рытуалаў: радзін, вяселля, пахавання.

У цэлым можна сказаць, што сямейная абраднасць беларусаў у тым выглядзе, у якім яна зафіксавана рознымі даследчыкамі на працягу XIX – пачатку XX ст.[1], у межах кожнага рытуалу аднародная, галоўныя абрады, з некаторымі адхіленнямі ў розных мясцовасцях, супадаюць. Сапраўды, нашы палявыя даследаванні пераканаўча сведчаць, з аднаго боку, аб наяўнасці вялікай разнастайнасці кожнага з абрадаў трыяды (нават у адной вёсцы варыянты таго ці іншага рытуалу часам адрозніваюцца адзін ад аднаго і складам абраднасці, і сваім “парадкам”), з другога – аб супадзенні асноўных звычаяў і абрадаў, якія ўстойліва паўтараюцца з рытуалу ў рытуал: гэта, так бы мовіць, звычаёва-абрадавы

[1] Вяселле: абрад. Мінск, 1978; *Сысоў У.М.* Беларуская пахавальная абраднасць: структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння. Мінск, 1995; Радзіны: абрад. Песні. Мінск, 1998; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Мінск, 2001–2013.

мінімум, без якога ні радзіны, ні вяселле, ні пахаванне ў народнай свядомасці не маюць сілы закона.

У радзінах гэты мінімум – прытрымліванне цяжарнай жанчынай пэўных забаронаў, каб спрыяць паспяховаму зыходу родаў; закопванне плацэнты і захоўванне пупавіны (высушванне і захоўванне за іконай ці ў іншым месцы хаты); першае купанне нованароджанага і выліванне вады ў месцы, дзе не ходзяць людзі; наведванне парадзіхі; выбар хросных і хрышчэнне дзіцяці; імянарачэнне; святкаванне хрэсьбін; "разрэзанне путаў" дзіцяці, калі яно робіць першыя крокі; звычай стрыгчы дзіця не раней чым праз год і не выкідаць дзіцячыя валосікі.

Абрадавы мінімум вяселля складаюць сватаўство, заручыны, выпечка каравая (каравояў), апрананне, благаславенне і надзяленне маладых, вянчанне, застолле ў доме маладой, развітанне яе з бацькоўскай хатай, пераезд маладой ў дом маладога, застолле ў доме маладога, наведванне маладой жонкі яе бацькамі праз некаторы час пасля вяселля.

Інварыянтны касцяк рытуалу пахавання ўтварае паслядоўнасць такіх дзеянняў, як запальванне свечкі каля нябожчыка, абмыванне і апрананне яго (ваду, якой абмывалі памерлага, як і ваду, у якой першы раз купалі дзіця, вылівалі туды, дзе не хадзілі людзі і не свяціла сонца; нежанатых і незамужніх апраналі ў вясельны ўбор), пакладанне ў труну, абавязковае (не менш чым адну ноч) знаходжанне нябожчыка ў сваёй хаце, адпяванне, вынас нагамі ўперад, спыненне на ўласным двары і потым каля кожнага крыжа на вёсцы, развітанне з нябожчыкам на могілках, устанаўленне крыжа на магіле.

Разам з абрадавым мінімумам існуе група абрадаў, якія не выконваюцца з такой строгасцю, як абавязковыя. Іх можна назваць дадатковымі. Як абавязковыя, так і дадатковыя складнікі кожнага з рытуалаў або маюць дакладную часавую прымеркаванасць у агульным ходзе рытуалу, або ў розных канкрэтных варыянтах выконваюцца ў розны час. Абрады першай групы адносяцца да дакладна прымеркаваных, другой – да мабільных[1]. Менавіта мабільныя абрады валодаюць уласцівасцю ўтвараць вакол абавязковых і ўстойліва замацаваных дадатковых абрадаў шматлікія арыгінальныя камбінацыі, і гэта ў значнай ступені тлумачыць разнастайнасць канкрэтных форм рытуалу радзін, вяселля і пахавання кожнага з рэгіёнаў Беларусі. У цэлым лакальная разнастайнасць іх варыянтаў абумоўлена ў асноўным двума

[1] Аналізуючы асноўныя этапы, напрыклад, беларускага вясельнага рытуалу і выяўляючы іх істотныя прыкметы, М.М. Нікольскі ў рабоце "Происхождение и история белорусской свадебной обрядности" (Мінск, 1956) размяжоўвае спецыфічныя (пастаянныя) і не звязаныя з імі абрады; А.В. Гура, выяўляючы структуру паўночнарускага вясельнага рытуалу, адрознівае ў ім "абавязковыя" і "факультатыўныя" элементы (гл.: *Гура А.В.* Опыт выявления структуры севернорусского свадебного обряда (по материалам Вологодской губ.) // Русский народный свадебный обряд: исследования и материалы. Л., 1978. С. 75).

ўзаемна каардынаванымі момантамі: абрадавым складам рытуалу і характарам музычна-паэтычнага яго асэнсавання.

Першы рытуал у трыядзе сямейнага цыкла – **радзіны**. Нараджэнне чалавека – падзея, якая суправаджаецца комплексам спецыяльных абрадавых дзеянняў: пластычных, вербальных, музычных і інш. Новanароджаны мае толькі фізічную існасць. Статус чалавека грамадскага і члена пэўнай сям'і ён набывае ў абрадах, што адбываюцца адразу ж пасля родаў, і "толькі дзякуючы гэтым абрадам ён уключаецца ў супольнасць тых, хто жыве"[1].

У недалёкім мінулым радзінныя звычаі і абрады складаліся з трох цесна звязаных цыклаў: дародавага, родавага і пасляродавага. У першыя два ўваходзілі звычаі, уяўленні, павер'і, абрадавыя дзеянні, накіраваныя на захаванне і паспяховае завяршэнне родаў. Пасляродавы цыкл быў накіраваны на прыняцце новаароджанага ў сямейна-грамадскую супольнасць. Ён уключаў у сябе абрады і звычаі імянарачэння дзіцяці, наведвання парадзіхі і новаароджанага, выбару кумоў, далучэння дзіцяці да хатняга ачага (якое папярэднічала царкоўнаму хрышчэнню), а таксама абрады хрэсьбін (хрысцін, ксцін, радзін), ачышчэння і першага пастрыжэння дзіцяці. У цэлым увесь гэты комплекс абрадаў меў на мэце забеспячэнне новаароджанаму шчаслівага, заможнага і маральнага жыцця, абарону яго ад злых сіл, хвароб і няшчасця, падрыхтоўку да дарослага жыцця.

Сучасны комплекс радзінных абрадаў і звычаяў на Беларусі складаецца з двух цыклаў – дародавага і пасляродавага. У параўнанні з мінулымі стагоддзямі поўнасцю знік родавы цыкл у сувязі з тым, што зараз роды адбываюцца ў спецыялізаваных радзільных дамах.

Параўнальны аналіз матэрыялаў з розных рэгіёнаў паказвае, што на фоне агульнаэтнічных рысаў, якія ўласцівы радзіннай абраднасці беларусаў у цэлым, мясцовая асаблівасць названых абрадаў і звычаяў праяўляецца ў элементах і дэталях іх структуры, у большай або меншай колькасці абрадавых дзеянняў і парадку іх выканання, у некаторых адрозненнях абрадавых атрыбутаў, сімвалаў і г.д. Так, матэрыялы сучасных этнаграфічных экспедыцый, напрыклад на Паазер'е, сведчаць аб тым, што ў параўнанні з мінулым стагоддзем значна скарацілася колькасць вераванняў і прыкмет, звязаных з цяжарнасцю жанчыны. У абагульненым выглядзе яны выражаюць думку, што цяжарнай жанчыне трэба паводзіць сябе спакойна ("акуратна"), пазбягаць хваляванняў, тады і дзіця народзіцца спакойнае і здаровае.

Сучасны пасляродавы цыкл радзінных абрадаў і звычаяў адкрываецца тут першым купаннем дзіцяці пасля выпіскі парадзіхі і новаароджанага з раддома. Па-ранейшаму ў свядомасці сучасных сельскіх (іншым разам і гарадскіх) жыхароў існуе перакананне, што першае купанне дзіцяці – гэта не проста неабходная гігіенічная працэдура, а значна больш важны момант, які ў нечым можа станоўча ці адмоўна паўплываць на далейшы лёс дзіцяці. Па гэтай прычыне паў-

[1] *Мирча Элиаде.* Священное и мирское. М., 1994. С. 115.

сюль у ваду пры першым купанні кладуць манету або залаты пярсцёнак ці які-небудзь невялікі срэбны прадмет, “каб дзіця было багатае”. Для першага купання запрашаюць сталую, вопытную жанчыну – сваячку або суседку, сяброўку, якая пасля лічыцца хроснай бабкай дзіцяці.

Трансфармаваўся і абрад імянарачэння дзіцяці. Зараз імя для свайго сына ці дачкі бацькі выбіраюць разам або для хлопчыка – бацька, для дзяўчынкі – маці. Пры гэтым на іх рашэнне, як правіла, аказвае ўплыў своеасаблівая мода на жаночыя і мужчынскія імёны ў пэўны перыяд.

У XIX–XX стст. даследчыкі зафіксавалі каля 50 пяшчотных слоў, з якімі маці звярталася да свайго маленькага дзіцяці. Сучасныя даныя сведчаць аб значным скарачэнні гэтага слоўнікавага запасу, тым не менш некаторыя традыцыйныя словы-звароты да немаўляці захоўваюцца і сёння, напрыклад “смехатунчык”, “плаксачка”, “лялечка”, “сонейка”, “малятачка”, “пісканятачка”, “тэптачка”, “зайчык”, “коцік”, “цвецік”.

Захоўваецца і традыцыя не называць сваіх дзяцей імёнамі людзей, якія маюць у вёсцы ці наваколлі дрэнную рэпутацыю п’яніц, гультаёў, злодзеяў.

Па-іншаму выбіраюць зараз і кумоў. Так, бацька нованароджанага запрашае кума, а маці – куму. Пры гэтым яны не ідуць спецыяльна да іх у хату, а могуць зрабіць гэта, сустрэўшы выпадкова на вуліцы ці пазваніўшы па тэлефоне. Быць кумам зараз лічыцца не так прэстыжна, як у мінулым, таму сёння даволі часта сустракаюцца выпадкі адмаўлення ад кумаўства, што раней вельмі асуджалася грамадой.

Найбольш урачыста і маляўніча да сённяшняга дня праходзяць хрэсьбіны. Яны святкуюцца зараз у перыяд ад двух-трох месяцаў з дня нараджэння дзіцяці і да года і супадаюць з днём хрышчэння ў царкве ці касцёле.

Першае пастрыжэнне дзіцяці па традыцыі адбывалася, калі яму спаўняўся год. Зараз стрыжэ той, хто мае хоць нейкія навыкі цырульнай справы, у той час як у мінулым першае пастрыжэнне дазвалялася толькі блізкім сваякам дзіцяці. Састрыжаныя валосікі, як і раней, затыкаюць над ганкам пры ўваходзе ў хату або пад маціцу ў хаце, дзе яны або захоўваюцца да дасягнення паўналецця, або ў хуткім часе спальваюцца.

Трывала захоўваюцца да нашага часу традыцыйныя ўяўленні і абрадавыя дзеянні, звязаныя з першым крокам дзіцяці. Паўсюль на Паазер’і, асабліва ў сем’ях, дзе ёсць прадстаўнікі старэйшага пакалення, у гэтым выпадку “разразаюць путы” дзіцяці, г. зн. праводзяць нажом па падлозе ці зямлі паміж ножак дзіцяці ў той момант, калі яно робіць свае першыя крокі.

Спецыфіка шэрагу этнаграфічных праяў паўночнабеларускага радзіннага рытуалу несумненна надае яму рэгіянальную адметнасць. Але найбольш яскравая рыса, якая ўласціва радзінам толькі Беларускага Паазер’я, – гэта спецыяльныя абрадавыя песні, што выконваюцца на тыповыя політэкставыя напевы і суправаджаюць усе этапы рытуалу. На ўсёй астатняй тэрыторыі Беларусі ў час святкавання радзін

выконваюцца любыя пазаабрадавыя (часцей бяседныя) песні, якія зместам і эмацыянальнай афарбоўкай адпавядаюць сутнасці абраду.

У заходнім гісторыка-этнаграфічным рэгіёне Беларусі – Гродзенскім Панямонні – у радзінах захоўваюцца ўсе тыя асаблівасці, якія былі адзначаны Т.І. Кухаронак у манаграфіі, прысвечанай радзінным звычаям і абрадам беларусаў[1]: гэта наведванне парадзіхі пасля родаў на працягу аднаго тыдня[2], выбар кумоў пераважна з чужых, а не сваякоў[3], як правіла, яешня, а не каша ў якасці рытуальнай стравы на хрэсьбінах[4], кропачнае распаўсюджванне абраду разбівання гаршка з бабінай кашай[5], такія прыёмы абыходжання з састрыжанымі валасамі, як спальванне, кіданне на ваду, затыканне ў сцяну хаты[6].

Высокая ступень рэлігійнасці мясцовага насельніцтва прыводзіць да таго, што на Панямонні радзей, чым у іншых рэгіёнах, звяртаюцца па дапамогу да знахараў: “Мы ў Бога веруюшчыя, і нам усё ад Бога дано. Знахары – яны кажуць, што яны ад Бога, ну ж яны ні сільней за Бога!” (Надзея Арэхава, 1910 г.н., пас. Першамайскі, Лідскі раён). Тут вялікае значэнне надаецца хрышчэнню. Трэба адзначыць, што ў драматургіі хрэсьбін кульмінацыйны момант прыпадае не на выкуп гаршка бабінай кашы і яго біццё (як у іншых рэгіёнах), а на катанне бабкі па сялу як вяршыню яе ўшанавання.

Параўнанне абрадавых песенных практык Гродзенскага Панямоння і іншых рэгіёнаў прыводзіць да вываду, што адной з найгалоўнейшых спецыфічных рыс песеннай культуры гэтага рэгіёна з’яўляецца больш слабая захаванасць старажытнага гісторыка-стылявога пласта. Так, у параўнанні з традыцыяй Паазер’я, дзе песенны цыкл радзін з’яўляецца ў маштабах Беларусі найбольш поўным[7], на Панямонні складваецца іншая карціна. Тут тыповыя радзінныя мелодыі сустракаюцца толькі ў Астравецка-Ашмянска-Смаргонскім арэале. Мяркуючы па назапашаным матэрыяле, на большай частцы заходнебеларускага рэгіёна яны амаль цалкам адсутнічаюць, выключэнне складаюць толькі песні пра кума і куму. На радзінах у асноўным спяваюць песні бяседныя і “любыя, якія жанчынам наравяцца”.

Спецыфічныя рысы радзін на Брэсцкім Палессі тычацца розных бакоў рытуалу, але ў цэлым усім асноўным абрадавым дзеянням, у параўнанні, напрыклад, з традыцыяй Віцебскага Падзвіння, уласцівы больш сцıслы, лапідарны характар. Асабліва гэта тычыцца традыцый хрэсьбіннага застолля, якое маглі і зусім не спраўляць, лічачы, што “ў

[1] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст. Мінск, 1993. 126 с.
[2] Тамсама. С. 43, карта 1.
[3] Тамсама. С. 54, карта 2.
[4] Тамсама. С. 61, карта 3.
[5] Тамсама. С. 62, карта 4.
[6] Тамсама. С. 93, карта 5.
[7] *Катвіцкая І.С.* Радзіны // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне. Мінск, 2004. С. 231–259.

радзінах сама глаўнае, шоб хрэшчаны був. А там ці робяць хрысціны, ці не робяць – бэзразлічно" (Вольга Пракапюк, 1939 г.н., в. Дубіца, Брэсці раён). Калі ж хрэсьбіны спраўлялі, то яны мелі "скарочаны выгляд": так, пашыраны па ўсёй Беларусі абрад "бабіна каша" ў поўным выглядзе характэрны толькі для Столінскага і Лунінецкага раёнаў, па меры ж прасоўвання на захад ён паступова страчвае сваё значэнне аж да поўнай адсутнасці ў многіх вёсках Брэсцкага раёна; нячаста сустракаецца і абрад з назвай "цяганне бабкі на баране". У радзіннай традыцыі Брэсцкага Палесся таксама няма спецыяльных песень, якія былі б дакладна прымеркаваны толькі да радзін і мелі пэўны музычны стыль (як на Віцебскім Падзвінні і тэрыторыях Гродзеншчыны, Міншчыны і Магілёўшчыны, што мяжуюць з ім). Свая спецыфіка ёсць і ў народнай тэрміналогіі: ва ўсходніх раёнах Брэстчыны першае купанне дзіцяці мае спецыяльную назву – "зліўкі"; у Маларыцка-Брэсцка-Камянецкім лакале цяжарную жанчыну называлі "грубая", у той час як на астатняй тэрыторыі рэгіёна для яе была іншая назва – "тоўстая".

Ва ўсходнім рэгіёне Беларускага Палесся, які складаецца з двух арэалаў – Гомельскага Палесся і Гомельскага Падняпроўя, рытуал радзін вызначаецца развітасцю і яскравасцю. Пра гэта сведчаць і расказы мясцовых інфармантаў, у якіх адлюстроўваецца не толькі сучасны стан традыцыі, але і звычаі, што бытавалі тут яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст. Напрыклад, пацвярджаюцца высновы Т.І. Кухаронак[1] аб тым, што на большай частцы рэгіёна наведванне парадзіхі пасля родаў адбывалася на працягу пераважна аднаго дня, а на поўдні палескага арэала – на працягу тыдня і больш[2]; выбіраючы кумоў, на падняпроўскай частцы арэала арыентаваліся прыкладна аднолькава на сваякоў і несваякоў, а ў палескай частцы – на сваякоў рознай ступені сваяцтва[3]; паўсюдна ў якасці рытуальнай стравы на хрэсьбінах бытуе крута звараная каша[4]; таксама шырока вядомы абрад разбівання гаршка з бабінай кашай[5]; найбольш распаўсюджаны прыём абыходжання з састрыжанымі коскамі дзіцяці – спальванне – пашыраны ў абодвух арэалах Гомельшчыны, у той час як на поўдні палескага арэала коскі дзіцяці кідаюць на ваду[6]. Тым не менш многае ў сучасным рытуале радзін на Гомельшчыне зазнала трансфармацыю. Так, у рэгіёне скарацілася колькасць вераванняў і прыкмет, звязаных з цяжарнасцю жанчыны; імя для свайго сына ці дачкі выбіраюць бацькі разам, або для хлопчыка – бацька, для дзяўчынкі – маці. Пры гэтым на іх рашэнне, як і паўсюдна на Беларусі, аказвае ўплыў мода на пэўныя жаночыя і мужчынскія імёны, папулярныя ў той ці іншы перыяд. І быць кумам зараз ужо не так прэстыжна, як раней.

[1] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст.
[2] Тамсама. С. 43, карта 1.
[3] Тамсама. С. 54, карта 2.
[4] Тамсама. С. 61, карта 3.
[5] Тамсама. С. 62, карта 4.
[6] Тамсама. С. 93, карта 5.




Ой, прыйшлі дзевкі, прыйшлі
Да ці ня руту й шчыпаці.

Да ці ня руту й шчыпаці,
У Марынкі прауды пытаці:

– Малада й Марыначка,
Мы в цябе да папытаемся,

Мы в цябе да папытаемся,
Што цябе да ў вянок віці?

– Ой, дзевачкі, мае сястрыцы,
Ці вы самі ні знаяця,

Ці вы самі ні знаяця,
Што ў мяне да пытаяцця?

Ўсялякія краскі зьбірайця,
Мне ў вяночак ўвівайця.

*(в. Сейлавічы, Нясвіжскі раён)*

## *КАРАВАЙ*

У побыце цяперашняй беларускай вёскі каравайныя традыцыі працягваюць сваё жыццё, моцна знітоўваючы мінулае і сучаснае, падкрэсліваючы павагу карэнных вясковых беларусаў да свайго галоўнага багацця – хлеба. Як і стагоддзе таму назад, традыцыйны беларускі каравай у многіх мясцінах з'яўляецца неад'емным атрыбутам вяселля, па-ранейшаму яму адводзіцца пачэснае месца, ён фігуруе ва ўзлавых момантах рытуалу, і на ўсім шляху "вясельнага руху" яго суправаджаюць спецыяльныя песні.

Назіранне за беларускай каравайнай традыцыяй прыводзіць да выяўлення дзвюх узаемазвязаных тэндэнцый. З аднаго боку, гэта наяўнасць устойлівых кампанентаў абраду, без абавязковага выканання якіх свяшчэнны вясельны хлеб страчвае свае ўласцівасці і сэнс (збор каравайніц, расчыненне каравая, яго вымешванне, выпечка, упрыгожванне, выманне з печы, вынас у іншае памяшканне для захавання да вяселля, падзел паміж удзельнікамі ўрачыстасці). Дадзены комплекс вызначае цэласнасць каравайнай традыцыі беларусаў. З другога боку, гэта варыятыўнасць усіх складнікаў каравайнага рытуалу і наяўнасць мабільных кампанентаў, што прыводзіць да ўтварэння яскравых рэгіянальных і лакальных адметнасцей.

Так, у Мсціслаўскім і Хоцімскім раёнах Магілёўшчыны каравай – гэта проста булка хлеба (праўда, з лепшай мукі), круглая, без усялякіх аздабленняў. У в. Трасціно Хоцімскага раёна на вяселле пяклі пірагі і спецыяльную булку хлеба, у якую ўторквалі сярэбраныя манеты, насыпалі соль і з якою сустракалі маладых пасля вянца. Тут не спявалі каравайных песень. На поўдні Магілёўшчыны (Слаўгарадскі, Быхаўскі раёны) ужо гатавалі сапраўдны каравай, упрыгожвалі яго разнастайнымі завітушкамі, шышачкамі, качачкамі, бочачкамі з цеста, перавязвалі чырвонай або ружовай стужкай і адносілі ў камору. Пякла каравай хросная маці маладога

ці маладой (адна або з сяброўкамі нявесты) у суботу, напярэдадні вяселля. У в. Вараніно Быхаўскага раёна захавалася адна каравайная песня:

**149.**




А карваю, мой раю*,
Я ж цябе учыняю.

А хто ж цябе да мясіць будзя**
Ручкамі да беленькамі?

Ручкамі да беленькамі,
Персьнямі залаценькамі?

А ў нашым карваі
З двенаццаці калодзежаў вада,

З дзісяці кароў масла
І яец паўтараста.

* У першай страфе кожны радок паўтараецца двойчы.
** Пачынаючы з другой страфы, першы радок паўтараецца двойчы.

*(в. Вараніно, Быхаўскі раён)*

У Бабруйскім раёне, традыцыі якога блізкія да палескіх, каравайны абрад быў значна больш развітым. Пачынаўся ён у суботу, у першы дзень вяселля, і ладзіўся асобна ў хаце маладога і ў хаце мала-

дой. Для выпечкі каравая рыхтавалі спецыяльныя бярозавыя ці альховыя дровы, бралі самую лепшую муку, самую чыстую ваду, самае тлустае масла, самыя буйныя яйкі. Нават венік для вымятання печы ў гэты дзень быў новы. Старшаю каравайніцаю была хросная маці маладога або маладой, ёй дапамагалі яшчэ тры-чатыры жанчыны, якіх называлі каравайніцамі. Да іх з боку сям'і жаніха або нявесты, з боку ўсёй грамады прад'яўляліся вялікія патрабаванні: каб яны былі замужнія, спакойныя, здаровыя, мелі добрую рэпутацыю ў наваколлі. Увесь працэс выпечкі каравая суправаджаўся спецыяльнымі каравайнымі песнямі:

**150.**




*"Як каравай зачынаюць"*

Ніхто не ўгадае*,
Хто наш каравай ўчыняе.

Да з блізенькага сяла,
Да з багатага двара.

То Іванкава жана,
Да яна прыбіралася,

Да яна прыбіралася,
К караваю сабіралася.

А ніхто не ўгадае,
Да што ў нашым каравае.

Да з сямі млыноў мука,
Да з сямі крыніц вада,

Ўсё траецкае масла,
Дай, Бог, маладым шчасця.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

*(в. Малыя Бортнікі, Бабруйскі раён)*

Навукова-папулярнае выданне

**Варфаламеева** Тамара Барысаўна

**СЯМЕЙНЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ**

З электронным дадаткам

Рэдактар *Л.М. Макейчык*
Мастацкі рэдактар *Т.В. Шабунька*
Тэхнічны рэдактар *Н.А. Лебядзевіч*
Карэктар *Т.К. Хваль*
Камп'ютэрная вёрстка *Н.В. Шабуні*
Набор нот *Т.С. Васільевай*

Падпісана ў друк 18.01.2017. Фармат 70×100/16. Папера афсетная. Гарнітура «GaramondBookC». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 58,5 + 1,3 каляр. укл. Ул.-выд. арк. 49,8 + 1,28 (электрон. дад.). Тыраж 600 экз. Заказ 41.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Вышэйшая школа"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/3 ад 08.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220048, Мінск.
e-mail: market@vshph.com http://vshph.com

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

# ЗМЕСТ ЭЛЕКТРОННАГА ДАДАТКУ

Запісы: *І.В. Мазюк*
Складальнікі: *І.В. Мазюк, Т.Б. Варфаламеева*
Тэхнічная апрацоўка і работа з гукам: *Я.А. Жук, І.В. Мазюк*

## ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

1. Ўсе дзевочкі ў краскі ідуць
2. Ой, бероза, бероза
3. Прыехалі да заручыны
4. Зборная субота настала
5. Мы табе, Манячка, вяночык в'ём
6. Коровай гічэ-гічэ, коровайнычок клычэ
7. Ой, споры, Божэ, пэршому короваю
8. Коровайночкы рукы мылы
9. Старшая каравайночка
10. Ой, я сучу сьвечы
11. Йу каго-то ў печы паліцца
12. Ой, быстрая рэчэнька Дунаёк
13. Коровай-короваю, я тыбэ й убыраю
14. На тэсовым століку
15. Наш коровай вышчый, наш молодый хорішчый
16. Йу саду й калына цвытэ
17. Маты сына да выражае
18. Маці сына й да выражала
19. На небі месічак сьвяціўся
20. Стайіць дубочэк нецярэбляны
21. Сыпце ав'ёс шчэ у новые карыта
22. Памалімоса Богу
23. А на дварэ дажджы-маразы, нягода
24. Лэтілы гусонькы чэрэз сад
25. Громкае дзерава каліна
26. Тэшча зятя
27. Нэ сэды, Манечка, й нэ сэды
28. Да лецеў салавейко, чы-чы-чы
29. Стукнула-грукнула на дварэ
30. А як добранька глядзець
31. Лятуць-лятуць белы лебядзі цераз сад
32. Над морэм сонцэ грало
33. Да сэчытэ калыноньку ж, рубайтэ
34. Тэстэнько зятя выном вытае
35. Пабірайса, Іванко
36. Да сядзела Танечка вышэй ўсіх
37. Дэ й падзякуймо Богу
38. Расьсьцілаецца, разьвіваецца
39. В огорыдчыку у новэнькому
40. Анголы по окнах
41. Да лэтілы гусонькы чэрэз сад
42. Ой, шоб я знала, шоб я відала – настойла
43. Да хто, да хто цёмнай ночачкі ні даспаў
44. Ой, знаці-знаці па весельлейку
45. Крача-крачэ утачка
46. Ой, з начы, з начы, з поўначы
47. Бацюхно мой родненькій
48. Ой, у лесе, в лесе да медзьведзь рыкае
49. Ой, родэ-родэ, да всэ багатый
50. Казалі, у лузя каліны многа, каліны многа
51. Світовая зоронька
52. Кінула ключы, з-за стола йдучы
53. З намы, Ганночка, з намы
54. Коціліса колёса да по раньней росе
55. Чому, Манечка, й нэ вэчэраеш
56. Матёнко моя, росстаемося
57. Зрушце да коні, зрушце
58. Кукуя зязюля, кукуя
59. Кляновая да лісьціночко
60. Ужэ сонечко, ужэ яснае
61. Конымі тупу-тупу
62. Ясна зоройка на стріху ўпала
63. Шчо вы, сваце, покозеліса
64. Узышоў месячык з яснаю зарой
65. За сэлом выйшла хмара
66. А ня год жа мы ждалі
67. Асьцерагайцеся, сваткі
68. Ваш малады, як пень смаляны
69. Дружэчко-маршалочку, ны дывыся в чарочку
70. Ой, свату, свату, пусты й у хату
71. Ой, день добрый, добрыя люды, мы до вас
72. Подзівіса, сваце, на мэне
73. Наша молода, як ластовка
74. Младзенькі Ванячка умеў жонкі выбіраці
75. Ой, сваціцы, да й галубіцы, просім вас
76. Ой, сваночко, да голубочко, прошу вас
77. З віннаго да калодзезя

**Сістэмныя патрабаванні:**

аперацыйныя сістэмы: Windows 7, Windows 8, Windows Vista;
браўзеры: IE, Chrome, Safari, Firefox (актуальныя версіі);
устройства для чытання DVD дыскаў, гукавая карта, устройства ўзнаўлення гуку.